# Удзел у рэспубліканскім суботніку

У сонечны выхадны дзень у Беларусі праходзіў рэспубліканскі суботнік. Супрацоўнікі цэнтральнага апарату Мінсувязі разам з першым намеснікам міністра Дзмітрыем Шэдко прынялі ўдзел ва ўборцы адной з мінскіх вуліц.

Кіраўнік ведамства Сяргей Папкоў прыняў удзел у суботніку на сваёй малой радзіме - у Дрыбінскім раёне. Нарадзіўся Сяргей Пятровіч у вёсцы Расна Горацкага раёна Магілёўскай вобласці, аднак ў 1989 годзе частка Горацкага раёна была ўключана ў ізноў утвораны (адноўлены) Дрыбінскі раён.

Разам з землякамі Міністр прыняў удзел у высадцы елак у Раснянскім лясніцтве ДЛГУ Гарэцкага лясгаса.

*ДЛГУ Гарэцкі лясгас Магілёўскага ДВЛГА размешчаны ў паўночна-усходняй частцы Магілёўскай вобласці на тэрыторыі 4 адміністрацыйных раёнаў: Гарэцкага, Дрыбінскага, Мсціслаўскага і Крычаўскага. Найбольшая працягласць тэрыторыі лясгаса - з поўначы на поўдзень - 68 км і з усходу на захад - 89 км. У склад лясгаса ўваходзіць 8 лясніцтваў: Горацкае, Дабранскае, Зуброўскае, Першамайскае, Мсціслаўскае, Раснянскае, цёмналесскае, Ходасаўскае.*

Дарэчы, у рэспубліканскім суботніку прынялі ўдзел больш за 29 тысяч работнікаў арганізацый сістэмы Мінсувязі, пералічана 112,6 тысяч рублёў грашовых сродкаў, зароблены на суботніку
.

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/23-04-2018-2971*